# 19 снежня 2022 года адбылася прэс-канферэнцыя «Гісторыя і сучаснасць беларускай літаратуры на старонках беларускіх часопісаў»

19.12.2022 90 Дом прэссы Комментариев нет

__19 снежня 2022 г. у 12.00__ у Прэс-цэнтры Дома прэсы адбылася прэс-канферэнцыя, прымеркаваная да 100-годдзя часопіса «Полымя», на тэму: **«Гісторыя і сучаснасць беларускай літаратуры на старонках беларускіх часопісаў».**




*Удзел прынялі:*

- **Карлюкевіч Алесь Мікалаевіч** – Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар Выдавецкага дома «Звязда»;




- **Бадак Алесь Мікалаевіч** – дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура»;



- **Шніп Віктар Анатольевіч** – намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» – галоўны рэдактар часопіса «Полымя»;




- **Саверчанка Іван Васільевіч –** дырэктар філіяла «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар;



- **Амосава Юлія Уладзіміраўна** – галоўны бібліёграф інфармацыйна-аналітычнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі;




- **Казапалянская Наталля Міхайлаўна** – рэдактар аддзела крытыкі і літаратуразнаўства часопіса «Полымя»;



- **Касцючэнка Наталля Мікалаеўна** – галоўны рэдактар часопіса «Нёман»;



- **Алейчанка Юлія Аляксандраўна** – рэдактар аддзела паэзіі і крытыкі часопіса «Маладосць».




*Пасля грамадзянскай вайны паўстала праблема арганізацыйнага і прафесійнага аб'яднання «пралетарскіх пісьменнікаў», як тады называліся творцы слова. Тым больш што ў літаратуру ішло новае пакаленне маладых ад «станка і плуга», якое хацела вучыцца і якому было ў каго вучыцца. Беларускую літаратуру «высокага мастацкага накірунку» прадстаўлялі Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны. Таму выхад першага нумара «Полымя» – часопіса літаратуры, палітыкі, культуры, эканомікі і публіцыстыкі (пазней «публіцыстыка» заменена на «гісторыю») – стаў адметнай з'явай у культурным жыцці рэспублікі. Выдаўцы «Полымя» аб'явілі чытачам, што нацыянальнае адраджэнне – гэта не лозунг і не самамэта, а лепшы спосаб далучыць працоўных рэспублікі да будаўніцтва сацыялістычнага ладу.*

*Першую вокладку часопіса «Полымя» аформіў мастак Міхась Філіповіч. Першыя дзесяць год (да 1932) часопісам кіравала рэдакцыйная калегія, у яе ўваходзілі Змітрок Бядуля, Цішка Гартны, Міхась Зарэцкі, Усевалад Ігнатоўскі, Янка Купала, Якуб Колас, В. Нодэль, А. Сянкевіч, Міхась Чарот і інш. У 1932—1941 гадах часопіс выходзіў пад назвай «Полымя рэвалюцыі». Першым галоўным рэдактарам яго быў прызначаны Платон Галавач (1932—1933). У гады Вялікай Айчыннай вайны выданне часопіса было прыпынена. Адноўлена ў студзені 1945 года.*

*У ліку галоўных рэдактараў "Полымя" былі вядомыя пісьменнікі: Міхась Лынькоў, Іван Мележ, Пятрусь Броўка, Максім Танк, Кастусь Кірэенка і нш. З ліпеня 2021 года галоўным рэдактарам часопіса працуе Віктар Шніп. За 100 гадоў выйшла 1118 нумароў часопіса "Полымя".*

*На сённяшні дзень у часопісе існуюць рубрыкі "Паэзія", "Проза", "Навуковыя публікацыі", "Крытыка і літаратуразнаўства", "Згадкі", "Дзённікі", "Штрыхі да партрэта", "Постаці", "Пошукі і знаходкі", "Спадчына", "Эпісталярый", "Братэрства", "Галасы свету", "Культура мовы", "Краязнаўства", "Кнігарня" і іншыя, у якіх адлюстроўваецца сучасны літаратурны працэс.*

Падрабязней у відэа.